На бягучым тыдні **Прэзідэнт** Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў **распараджэнне аб назначэнні грантаў** на 2025 год **46 лепшым спецыялістам** краіны, якія працуюць у галінах навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і маладзёжнай палітыкі.



Фота Маргарыты БАРАНОК.

# АДРАДЗІЦЬ полацкую набіванку

Сярод адзначаных у сферы культуры і палачанка **Таццяна БАРАНЕНКА** *(на фота)*, вядучы навуковы супрацоўнік філіяла «Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я» навукова-даследчай і асветніцкай установы культуры «Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік».

Працяг на 7 стар.

# АДРАДЗІЦЬ полацкую набіванку

*Працяг.*
*Пачатак на 1-й стар.*

Штомесячны грант у памеры 41 базавай велічыні на 2025 год прадастаўлены Таццяне Бараненка на рэалізацыю праекта «Полацкая набіванка», накіраванага на адраджэнне ў сучасных умовах народнай традыцыі па дэкарыраванні тканін у тэхніцы полацкай набіванкі, яе выкарыстанне ў практыцы работы арганізацый культуры, экскурсійнай, турыстычнай дзейнасці.

Пры нашай сустрэчы Таццяна Валер'еўна распавяла пра сябе. Нарадзілася яна ў 1989 годзе ў Полацку. Мае вышэйшую адукацыю. З адзнакай скончыла Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай па спецыяльнасці «айчынная гісторыя» і магістратуру гэтай установы адукацыі. Навуковым супрацоўнікам у Музеі традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я працуе з 2012 года. Увесь гэты час таленавітая маладая жанчына актыўна займаецца навуковай дзейнасцю, і ужо ўбачылі свет 15 навуковых артыкулаў яе аўтарства.



Што ўяўляе сабой полацкая набіванка? Набіванка («набойка», «выбойка», «крашаніна», «набіванне») — гэта адна з найстарэйшых тэхнік дэкарыравання тканіны, пры якой выкарыстоўваюцца дошкі-клішэ з рэльефным узорам. Мода на набойку распаўсюдзілася ў XVI – XVII стст., што абумовіла з'яўленне ў той час шматлікіх рамесных майстэрняў у Віцебску, Магілёве, Полацку, Оршы, Бабруйску. Набіванка як рамяство была папулярная і ў малых населеных пунктах поўначы Беларусі, дзе з яе дапамогай упрыгожвалася тканіна, з якой выраблялі элементы традыцыйнага касцюма: сарафаны, кашулі, фартухі. Узоры ўключалі ў сябе раслінныя матывы, геаметрычныя фігуры, выявы людзей і жывёл, а таксама сцэны з паўсядзённага жыцця.

На думку Таццяны Бараненка, набіванка ў наш час мае поўнае права заняць сваё пачэснае месца ў сучасным беларускім мастацтве, тым больш што зараз у Беларусі назіраецца павелічэнне цікавасці да гэтага рамяства.

Набіваныя тканіны — выдатны, багаты матэрыял для рамеснікаў і дызайнераў, яны лёгка ўпісваюцца ў сучасны інтэр'ер і напаўняюць своеасаблівым этнічным каларытам адзенне.

У рамках рэалізацыі праекта аўтар прадугледзіла вывучэнне гісторыі, тэхналогіі і мастацкіх асаблівасцей набіванкі на Полаччыне.

Падчас нашай размовы аўтар праекта «Полацкая набіванка» звярнулася па дапамогу да палачан і жыхароў раёна. Навукоўцы музея вядуць пошук прадметаў, звязаных з гісторыяй дадзенай тэхнікі дэкарыравання тканіны. Магчыма, у кагосьці з даўніх часоў захаваліся старыя дошкі-клішэ (як правіла, квадратныя, невялікага памеру драўляныя дошкі з выразаным рэльефным малюнкам з аднаго боку і з паглыбленнямі са зваротнага боку, прызначанымі для ручнога захопу) або драўляныя малаткі-кіянкі ці тканыя вырабы, упрыгожаныя ў тэхніцы набіванкі па тканіне (малюнак (адбітак) на тканіне, які выкананы фарбай). Гэтыя прадметы маглі б дапамагчы навуковым супрацоўнікам вывучаць гісторыю, тэхналогіі і мастацкія асаблівасці полацкай набіванкі, а таксама яе ролю ў культурнай спадчыне рэгіёна.

**Аліна БАЛЬШАКОВА.**
**Фота Маргарыты БАРАНОК.**



У планах — устанаўленне партнёрскіх сувязей з музеямі, мастацкімі цэнтрамі і супольнасцямі майстроў народнай творчасці з мэтай абмену вопытам, стварэння музейных выстаў, правядзення майстар-класаў, тэматычных заняткаў.

Прыгажосць набіванкі — у сціплай каляровай палітры. Таму з часам ёй стала цяжка канкурыраваць з вышыўкай і ткацтвам, дзе выкарыстоўваецца каляровая гама нітак. Са з'яўленнем фабрычнай вытворчасці набіваных тканін — з іх яркай палітрай колеру — набіванка да канца XIX ст. і зусім стала не запатрабаваная. У пачатку і сярэдзіне XX ст. вытворчасцю набіванкі займаліся толькі адзінкавыя майстры.